***

Літаратурна-краязнаўчае выданне прысвечана 75-годдзю з дня нараджэння Марыі Мікалаеўны Кулецкай — “Народнага майстра Беларусі” (з 2009 г.), “Ганаровага грамадзяніна Пружанскага раёна”

Выданне дапоўненае і дапрацаванае, асноўны ўпор зроблены на падзеі і творчыя дасягненні з 2020 па 2025 год. Пры складанні выкарыстоўваліся артыкулы з газет і часопісаў, рэсурсы інтэрнет і асабістыя запісы Марыі Мікалаеўны Кулецкай.

Пружанская ЦРБ ім. М. Засіма

# “Чароўная палітра Марыі Кулецкай”

Літаратурна-краязнаўчае выданне
(Дапоўненае і дапрацаванае)

**Пружаны, 2025**

## 26 лістапада 2025 — 75 гадоў з дня нараджэння Марыі Мікалаеўны Кулецкай — “Народнага майстра Беларусі” (з 2009 г.), “Ганаровага грамадзяніна Пружанскага раёна”



Нарадзілася 26 лістапада 1950 года ў вёсцы Навасёлкі Пружанскага раёна. Вучылася ў мясцовай школе, потым — у мастацкім прафесійным вучылішчы ў Бабруйску, дзе стала спецыялістам па афармленні інтэр’ераў (1969). У 1980 годзе скончыла Магілёўскі бібліятэчны тэхнікум. Працавала бібліятэкарам дзіцячай бібліятэкі. Член Беларускага Саюза майстроў народнай творчасці з 2006 года. Член Брэсцкага абласнога аддзялення Беларускага Саюза мастакоў народнай творчасці. Член Брэсцкага абласнога клуба майстроў народнай творчасці “Скарб”. Член Грамадскага

аб’яднання аматараў мастацтваў рэгіёна “Белавежская пушча” і Брэстчыны “Тур”. Кіраўнік класа роспісу па шкле Пружанскага гарадскога Палаца культуры да 2020 года. У 2009 годзе прысвоена званне “Народны майстар Беларусі” (мастацкі роспіс).

У 2020 годзе да 70-годдзя Марыі Кулецкай супрацоўнікі Пружанскай раённай бібліятэкі імя М. Засіма і Брэсцкага абласнога грамадска-культурнага цэнтра выдалі памятныя каталогі. У агульнай складанасці на 72 старонках размешчаны фотаздымкі дзясяткаў работ майстрыхі, шмат рэпартажных фотаздымкаў з раённых, абласных і нават рэспубліканскіх мерапрыемстваў, у якіх яна з задавальненнем прымала ўдзел. Акрамя фотаздымкаў, у каталогах таксама размешчана пазнавальная інфармацыя пра жыццё і дзейнасць М. Кулецкай.



Творчасць Марыі Кулецкай litrазнабаковая і шматгранная: жывапіс, саломапляценне, ткацтва, вышыўка, разьба па дрэву, выцінанка, роспіс па шкле.




Кожны год Марыя Кулецкая ўдзельнічае ў дзясятках мерапрыемстваў: выставах, семінарах, прэзентацыях, конкурсах.

Майстрыха аднавіла прызабыты і амаль згублены ўнікальны беларускі промысел – роспіс па шкле, які актыўна прапагандуе.

Пазнаць “шкляныя” карціны пружанскай мастачкі можна адразу. Яны адрозніваюцца насычанымі ярка-чырвонымі, зялёнымі, сінімі, жоўтымі фарбамі, ствараючы ў гледача пачуццё свята. Аднак, за простай манерай выканання, не вельмі глыбокім сюжэтам, нескладаным калорам, хаваюцца сапраўдныя мастацкія творы. Яе “шклінкі” не ўспрымаюцца як штосці спрошчанае і беззмястоўнае. За гэтай “прастатой” уважлівы глядач абавязкова ўбачыць густ, пачуццё меры, дасканалае валоданне тэхнікай.

Сёння, некалі страчаныя традыцыі, Марыя Мікалаеўна ахвотна перадае вучням.




***(З навучэнцамі Навасёлкаўскай СШ)***

Вялікую работу правяла Марыя Кулецкая для адраджэння малюнка на шкле. Яна зладзіла экспедыцыі па вывучэнню роспісу па шкле амаль па ўсім раёне, вывучала работы носьбітаў традыцый, каб засвоіць іх манеру і аднавіць тэхніку малявання. Шмат работ старых майстроў Марыя Мікалаеўна літаральна выратавала ад знішчэння, дзякуючы сваёй неабыякавасці. Некаторыя захоўваюцца ў яе прыватнай калекцыі, шмат работ яна перадала ў музеі, дзе іх захоўваюць даследчыкі традыцыйных беларускіх промыслаў.



***(Работа з экспедыцыі, падаравана Вользе Трубач)***

## Работы з экспедыцый













Мерапрыемствы, у якіх удзельнічае Марыя Мікалаеўна, заўсёды яркія і запамінальныя. 1 лістапада 2020 г. у цэнтральнай раённай бібліятэцы ім. М. Засіма адбылася сустрэча з народным майстрам. Тэмай





сустрэчы было "Адраджэнне традыцыйных рамёстваў Пружаншчыны". Марыя Мікалаеўна паказала гасцям спосабы роспісу па шкле, аплікацыю і пляценне саломкай, работу з карункамі. На сустрэчы прысутнічаў народны хор ветэранаў працы "Чырвоны гваздзік" пад кіраўніцтвам Юліі Пропер.





Неаднойчы работы Марыі Мікалаеўны дэманстраваліся на выставах у Мінску, Брэсце, на Пружаншчыне. У якасці сувеніраў шматлікія работы разышліся па розных краінах далёкага замежжа: Германіі, Італіі, Ірландыі, Польшчы. Чатыры работы знаходзяцца ў Нацыянальным музеі гісторыі і культуры, больш дзесяці – у калекцыях вядомых беларусаў.

Самабытную творчасць Марыі Кулецкай заўсёды з задавальненнем успрымаюць гледачы.




З 11 па 27 снежня 2020 года ў малой выставачнай зале абласнога грамадска-культурнага цэнтра дзейнічала юбілейная выстава творчых работ народнага майстра Рэспублікі Беларусь М. М. Кулецкай "Малюе сэрца — не рука" (або "Сардэчныя замалёўкі"), прысвечаная 70-годдзю майстра. *"Работы толькі на першы погляд здаюцца наіўнымі. На самай справе яны выкананы на высокім мастацкім узроўні, таму што Марыя Кулецкая ў першую чаргу мастак. Але ў гісторыю беларускага народнага мастацтва яна, на мой погляд, перш за ўсё ўвойдзе як майстар, які адрадзіў і захаваў для нашчадкаў роспіс па шкле. Яна*

*адпраўлялася ў экспедыцыі па Пружанскім раёне, знаходзіла гэтыя "шклінкі-маляванкі", вывучала манеру, почырк і тэхніку малявання старых майстроў, невядомых народных мастакоў",* — так ахарактарызавала творчасць М. Кулецкай загадчыца аддзела традыцыйнай культуры АГКЦ Ларыса Быцко.




У студзені 2022 года ў галерэі мастацтваў г. Бяроза дзейнічала выстава роспісу па шкле Марыі Кулецкай "Шчыра да сэрца".

На выставе былі прадстаўлены 52 работы майстра. Усе творы арыгінальныя, Марыя Кулецкая не капіруе традыцыйныя ўзоры, а стварае свае. Многія з іх зроблены па матывах народных абрадаў і свят, характэрных для беларускай нацыянальнай культуры. Сюжэтамі для яе карцін на шкле служаць прыгажосць родных мясцін і людзі, якія жывуць на гэтай зямлі. Майстар натхняецца вобразамі праваслаўных свят і анёлаў.



З задавальненнем Марыя Мікалаеўна праводзіць майстар-класы для дзяцей. Так, у чэрвені 2022 яна правяла майстар-клас па выцінанцы ў сярэдняй школе № 1 г. Пружаны. Хлопчыкі і дзяўчынкі даведаліся аб гісторыі гэтага віду дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, асаблівасцях стварэння твораў з паперы, іх прызначэнні і распаўсюджванні на нашых землях. Акрамя таго, дзеці з дапамогай вядомага майстра паспрабавалі стварыць прыгожыя ўзоры і кампазіцыі з паперы.

Неаднаразова Марыя Мікалаеўна станавілася гераіняй тэлесюжэтаў і фільмаў, якія дэманстраваліся на беларускім тэлебачанні і мясцовым тэлеканале "Пружаны ТВ".



У 2023 годзе ў Пружаны прыязджала Святлана Бароўская і здымачная група праграмы «Добрай раніцы, Беларусь!». Здымачная група тэлеканала «Беларусь 1» наведала музей-сядзібу «Пружанскі палацык». Пасля экскурсіі вядучая асабіста пазнаёмілася з народным майстрам Беларусі Марыяй

Кулецкай, разам з ёю журналіст асвойвала азы малявання па шкле, цікавілася творчым шляхам Марыі Мікалаеўны і сакрэтам доўгажыхарства маці майстрыхі Еўдакіі Мікітаўны Клімашэвіч, якая ў 2022 годзе адзначыла 100-гадовы юбілей.




Еўдакія Мікітаўна больш за 20 гадоў працавала бібліятэкарам у сістэме культуры Пружанскага раёна, за добрасумленную працу ўзнагароджвалася ганаровымі граматамі і медалямі. Любоў да жыцця, нязменны аптымізм і энергію яна перадала сваёй дачцэ Марыі Мікалаеўне Кулецкай і ўнучцы Ірыне, якія абедзве носяць ганаровае званне народнага майстра Рэспублікі Беларусь.

***(100-й дзень нараджэння адзначыла жыхарка Пружан Еўдакія Мікітаўна Клімашэвіч, фота “Раённыя будні”)***

Нягледзячы на сталы ўзрост, Еўдакія Мікітаўна актыўна займаецца творчасцю. Яна малюе на шкле, стварае прыгожыя кошыкі, якія дорыць сябрам і знаёмым. Еўдакія Мікітаўна, як і яе знакамітая дачка, не раз станавілася гераіняй рэпартажаў і тэлесюжэтаў.



Цікавы тэлесюжэт атрымаўся ў 2024 годзе, калі здымачная група тэлеканала «Беларусь 3» прыязджала на малую радзіму Марыі Мікалаеўны. У роднай




хаце майстра Марыя Мікалаеўна і яе матуля Еўдакія Мікітаўна Клімашэвіч расказвалі





пра жыццё, пра свае захапленні рознымі відамі мастацтва. Хата ў роднай в. Кабылаўка - гэта сапраўднае “месца сілы” ўсёй сям’і. Тут захоўваюцца рэчы, якія многа могуць расказаць пра сваіх гаспадароў — фотаздымкі, карціны, вышытыя ручнікі і шмат іншага.







*(Хата ў в. Кабылаўка)*




У другой частцы тэлесюжэта “Жывая спадчына” Марыя Мікалаеўна правяла майстар-клас у музеі-сядзібе “Пружанскі палацык”.

У 2023 годзе работы Марыі Кулецкай разам з работамі майстроў з усёй Беларусі былі прадстаўлены на выставе «Відзікі: беларускі традыцыйны роспіс на шкле», якая праходзіла ў мастацкай галерэі «Цэнтр» ДУ «Мінскі абласны цэнтр народнай творчасці».






Вынікам гэтай выставы стала выданне ў 2025 годзе каталога “Відзікі: беларускі традыцыйны роспіс на шкле”: каталог выставы, [5 красавіка — 14 мая 2023 г., Мастацкая галерэя "Цэнтр"], дзе размешчаны некаторыя работы Марыі Кулецкай. Таксама, работы майстрыхі можна пабачыць і на афіцыйнай старонцы Vidziki.art у сацыяльных сетках.

Таксама, у 2023 годзе, Марыя Мікалаеўна прыняла ўдзел у маштабным святкаванні 590-годдзя Пружан. Павільён з арыгінальнымі работамі народнага майстра не аставіў абыякавымі жыхароў і гасцей горада.



Акрамя іншага, Марыя Кулецкая аформіла эксклюзіўныя паштоўкі да 590-годдзя Пружан з выявамі галоўных славутасцей Пружаншчыны. Паштоўкі з задавальненнем набывалі ў якасці сувеніраў. Зараз сувенірная прадукцыя, аформленая малюнкамі Марыі Кулецкай, сапраўдны брэнд Пружаншчыны. У сувенірнай лаўцы можна набыць прадукцыю на любы густ — гэта і друкаваная прадукцыя, і духмяны чай, і салодкія вырабы, і нават традыцыйныя беларускія лялькі, створаныя майстрам.





2023 год выдаўся яркім і насычаным, як у культурным жыцці ўвогуле, так і ў творчым жыцці Марыі Мікалеўны.

У рамках рэспубліканскага праекта «Культурная спадчына Беларусі» майстры ўсіх рэгіёнаў удзельнічалі



ў рэспубліканскім праекце «Культурная спадчына Беларусі» і стварэнні пано «Карта Беларусі». Кожны раён Брэстчыны мае сваю адметнасць: Пружаншчыну сімвалізуе мясцовы традыцыйны роспіс па шкле, які адрадзіла Марыя Кулецкая. Пружанскі фрагмент стварыла жыхарка Смаляніцы Людміла Яроцкая (у 2024 годзе  прысвоена званне “Народны майстар Беларусі”), за аснову была ўзята работа Марыі Мікалаеўны Кулецкай “Галубкі” (2014 г.).

На пано «Карта Беларусі» побач з пружанскай птушкай месцяцца вышытыя гладдзю выявы  бездзежскага фартушка, Косаўскага палаца, лунінецкага абрада ваджэння куста, збанка і гаршчка-«мамзэлькі» з Гараднай Столінскага раёна… Варта звярнуць увагу і на фон: вышыўка на ім адпавядае традыцыйным узорам тканых ручнікоў кожнай мясцовасці.




***(“Пружанскі” фрагмент вышыванай карты)***



***(М. Кулецкая з Людмілай Яроцкай і Верай Волчык)***

2023 год адзначыўся яшчэ адной важнай падзеяй — на рэспубліканскім узроўні роспіс па шкле быў прызнаны аб‘ектам нематэрыяльнай спадчыны.

На пасяджэнні Беларускай рэспубліканскай навукова-метадычнай рады па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны пры Міністэрстве культуры, якое адбылося 6 сакавіка 2023 года, была аднагалосна падтрымана прапанова аб наданні статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці роспісу па шкле, што пашыраны ў Бярозаўскім і Пружанскім раёнах Брэсцкай вобласці.




Аднавіць традыцыю ўдалося дзякуючы народнаму майстру Марыі Кулецкай з Пружанаў. У пошуках карцін яна абышла ўсе Пружаны, праехала нямала вёсак, шукала работы старых майстроў, каб засвоіць іх манеру, аднавіць тэхніку. Маляванкі яна не капіравала — толькі пераймала тэхніку, засвойвала почырк народных мастакоў. Цікавасць да гэтага віду творчасці пераняла ад

бацькоў, перадала свае веды дачцэ, малююць на шкле і ўнукі майстра. Марыя Мікалаеўна папулярызуе роспіс па шкле з дапамогай правядзення выстаў і майстар-класаў, заахвочвае маладых мастакоў.

У 2024 годзе ў Пружанах праходзіў рэспубліканскі спартыўна-культурны фестываль “Вытокі: Крок да Алімпу”. Акрамя спартыўных мерапрыемстваў і лакацый, вялікая роля належала асвячэнню культурнага жыцця края. Сапраўдным упрыгожваннем свята стала работа ў гарадскім парку “Горада майстроў”. Сярод яго ўдзельнікаў – народны майстар Беларусі Марыя Кулецкая.

Работы Марыі Мікалаеўны прыцягвалі ўвагу гасцей свята, якія з задавальненнем фатаграфаваліся з майстрам і набывалі яе работы ў якасці арыгінальнага сувеніра. А работу “Вячоркі” Марыя Кулецкая падарыла арганізатарам моднага паказу на фестывалі Вытокі.









***(“Вячоркі”)***

У 2024 годзе да Марыі Мікалаеўны завіталі журналісты з тэлеканала “Россия” Культура РТР. Госці з Расіі з задавальненнем знаёміліся з беларускім народным промыслам — роспісам па шкле. Не абышлася сустрэча і без майстар-класа для вядучага Андрэя. Створаная пад кіраўніцтвам Марыі Міклаеўны карціна “Галубы” паехала разам са здымачнай групай у Расію.




 

Акрамя творчай дзейнасці Марыя Мікалаеўна мае актыўную грамадзянскую пазіцыю. Яна з’яўляецца членам Беларускага саюза жанчын. У сакавіку 2024 года ёй давялося прыняць удзел у сустрэчы актыва Беларускага саюза жанчын з Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь. На сустрэчы ўзнімаліся важныя сацыяльныя пытанні, таксама прысутныя жанчыны атрымалі віншаванні з галоўным вясновым святам 8 Сакавіка ад Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнка.

Шматлікія заслугі Марыі Мікалаеўны не маглі застацца па-за ўвагай кіраўніцтва Пружанскага раёна. На юбілейным мерапрыемстве з нагоды 85-годдзя стварэння Пружанскага раёна, якое 18 студзеня 2025 года адбылося ў Палацы культуры, было шмат прыемных падзей. Сярод іх – узнагароджанне заслужаных людзей, якім рашэннем Пружанскага раённага Савета дэпутатаў ад 9 снежня 2024 г. № 29

было прысвоена званне “Ганаровы грамадзянін Пружанскага раёна”.






За значны ўклад у захаванне, адраджэнне і папулярызацыю традыцыйнай беларускай культуры такое званне было нададзена Марыі Мікалаеўне Кулецкай.





4 снежня 2024 года Марыя Мікалаеўна Кулецкая ў складзе дэлегацыі Пружанскага раёна прымала ўдзел у святкаванні 85-годдзя Брэсцкай вобласці ў Брэсце.

У 2025 годзе на Пружаншчыне праходзіў рэспубліканскі семінар-практыкум «Захаванне гістарычнай памяці і культурнай спадчыны праз пераемнасць пакаленняў». Паглядзець некаторыя славутасці зямлі Пружанскай прыехалі дырэктары цэнтраў культуры і вольнага часу з усіх раёнаў і абласных цэнтраў краіны. Гасцей знаёмілі з турыстычнымі і культурнымі аб’ектамі Пружаншчыны, з творчасцю народных майстроў. Госці мелі магчымасць пазнаёміцца з творчасцю Марыі Мікалаеўны Кулецкай. Кіраўнік узорнай студыі дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва «Шклінка-маляванка» Вера Волчык прэзентавала элементы нематэрыяльнай гісторыка-

культурнай спадчыны «Традыцыйны роспіс па шкле» з удзелам народнага майстра Рэспублікі Беларусь.







***(М. Кулецкая з начальнікам аддзела народнай творчасці дзяржаўнай установы культуры змешанага тыпу «Рэспубліканскі цэнтр нацыянальных культур» Вольгай Хачковай падчас семінара)***

У маі 2025 года на працягу некалькіх дзён на Пружаншчыне праходзіла рэспубліканская навукова-практычная канферэнцыя «Шарашова і Пружанскі край: этнаграфічная, фальклорная, архітэктурная і мастацкая спадчына рэгіёна», якую ініцыянаваў райвыканкам пры арганізацыі Цэнтрам даследаванняў беларускай

культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

Адной з тэм даклада былі традыцыі роспісу па шкле, Марыя Кулецкая і Вера Волчык (кіраўнік студыі “Шклінка-маляванка”) зрабілі прэзентацыю сваіх работ.





***(Падчас навукова-практычнай канферэнцыі, у Пружанскай ЦРБ ім. М. Засіма, 2025 г. з В. Волчык і з Вольгай Трубач, малодшым навуковым супрацоўнікам аддзела фалькларыстыкі і культуры славянскіх народаў Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя Кандрата Крапівы)***

 

У гэтыя ж дні ў студыі дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва «Шклінка-маляванка» адбылася сустрэча Марыі Мікалаеўны Кулецкай і кіраўніка ўзорнай студыі Веры Віктараўны Волчык з Міхаілам Анатольевічам Міхайлецом, кандыдатам гістарычных навук, дацэнтам кафедры этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтваў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Асноўнай тэмай гутаркі стала нематэрыяльная культурная спадчына, у прыватнасці, роспіс па шкле, а таксама пытанні яго захавання і папулярызацыі. Марыя Кулецкая адзначыла, што такія віды творчасці, як роспіс па шкле, нясуць у сабе ўнікальныя культурныя коды і сімвалы, якія адлюстроўваюць гісторыю і звычаі беларускага народа. Абмяркоўваючы попыт на роспіс па шкле сярод турыстаў, абодва бакі прыйшлі да высновы, што цікавасць да гэтага рамяства расце. Турысты імкнуцца не толькі набыць унікальныя вырабы, але і даведацца аб працэсе іх стварэння. Гэта садзейнічае росту цікаўнасці да майстар-класаў і экскурсій, што спрыяе не толькі папулярызацыі мастацтва, але і ўмацаванню культурных сувязяў.



У красавіку 2025 года ў Брэсце адбылася першая абласная выстава майстроў народнай творчасці «Вясновыя напевы». Адраджэнне, захаванне і развіццё нацыянальнай культуры, аўтэнтычнага народнага мастацтва — асноўная мэта выставы. Убачыць багацце і разнастайнасць вырабаў можна было ў выставачнай зале абласнога грамадска-культурнага цэнтра. У экспазіцыі было прадстаўлена больш за 200 работ у разнастайных тэхніках: вышыўка і ткацтва, выцінанка, салома- і лозапляценне, валянне, ганчарства… Сярод іншых былі прадстаўлены і работы Марыі Кулецкай.




ДЫПЛОМ

УЗНАГАРОДЖВАЕЦЦА

Кулецкая Марыя

«Вясновыя напевы»

Жыццё Марыі Мікалаеўны багатае на цікавыя паездкі і сустрэчы з творчымі людзьмі. Такія сустрэчы даюць магчымасць захапіцца добрай энергіяй людзей, якія верна і самаадданa

працуюць дзеля захавання духоўных каштоўнасцей беларускай народнай культуры і яе традыцый.

Шчырая сустрэча адбылася з гасцінннай, улюблённай у сваю працу гаспадыняй музея “Бездзежскі фартушок” Марыяй Міхайлаўнай Астаповіч, якая з’яўляецца Ганаровым грамадзянінам Драгічынскага раёна і Чалавекам года 2024. Падчас сустрэчы Марыя Кулецкая перадала ў дар музею сваю работу.







***(У музеі народнай творчасці «Бездзежскі фартушок»)***



***(З беларускай пісьменніцай К. Хадасевіч-Лісавой)***




***(З мастаком Іванам Міхайлавічам Чарнякевічам і яго жонкай — мастачкай Верай Прохаравай)***



***(З Ганнай Хадаровіч)***



***(17.08.2024 Экскурсія ў Косава)***



***(Марыя Кулецкая з пружанскімі мастачкамі Галінай Локцевай і Юліяй Кунда)***

Марыя Мікалаеўна Кулецкая – сціплы і адкрыты чалавек, яна адносіцца да той групы сапраўдных беларускіх майстроў-працаўнікоў, мастакоў-альтруістаў, якія больш аддаюць, чым патрабуюць узамен. Шмат работ Марыі Кулецкай занялі сваё пачэснае месца не толькі ў музеях, але і ў дамах блізкіх ёй людзей.







*(Акварэль М. Кулецкай “Аранчыцкая Крыжаўзвіжанская царква”, у заказчыцы з Екацеранбурга)*

Марыя Мікалаеўна заўсёды жаданы госць у Пружанскай бібліятэцы, выставы з яе творамі прыцягваюць увагу наведвальнікаў бібліятэкі сваёй яркасцю і самабытнасцю. А мерапрыемствы, у якіх яна прымае ўдзел, не астаўляюць раўнадушнымі гледачоў усіх узростаў.









*(Марыя Кулецкая ў Пружанскай ЦРБ ім. М. Засіма)*




2025 год адзначыўся яшчэ адной яркай падзеяй. Творчыя дэлегацыі абласцей прымалі ўдзел у святкаванні Дня беларускай пісьменнасці ў Лідзе. На пляцоўцы Брэсцкай вобласці, арганізаванай ДУК “Брэсцкі абласны грамадска-культурны цэнтр” пры падтрымцы ўпраўлення культуры Брэсцкага аблвыканкама, працавалі майстры народных мастацкіх рамёстваў, дэманструючы традыцыйныя віды дэкаратыўна-прыкладного мастацтва, унесеныя ў Дзяржаўны спіс



элементаў нематэрыяльнай гісторыка-культурнай спадчыны. У экспазіцыю таксама ўвайшлі работы народнага майстра Марыі Кулецкай, выкананыя ў тэхніцы роспісу па шкле Пружанскага рэгіёна.




Госці свята маглі пазнаёміцца з метадычна-інфармацыйным выданнем па традыцыйным роспісе па шкле "Прыгажосць традыцыі Чароўнае шкло", дзе таксама прадстаўлены работы Марыі Мікалаеўны.

Марыя Кулецкая актыўна малюе карціны на шкле, праводзіць майстар-класы не толькі для пружанцаў, але і для гасцей горада. Так, у 2025 годзе да майстрыхі завіталі брэсцкія школьнікі, якія навучаюцца ў школе з мастацкім ухілам.



Сустрэча падкрэсліла значнасць роспісу па шкле як унікальнай мастацкай з’явы, неабходнасці далучэння моладзі да традыцый свайго народа.

Марыя Мікалаеўна не спыняе сваю творчую дзейнасць, яна пладатворна працуе, стварае новыя сюжэты, удзельнічае ў культурным жыцці края.



***(“Восеньскі настрой”, 2025)***






***(Календары, афармленыя М. Кулецкай)***

***Работы, створаныя ў 2025 годзе.***











Марыя Кулецкая назаўжды ўпісала сваё імя ў гісторыю беларускага народнага мастацтва. Яна стаяла каля вытокаў аднаўлення амаль паўзабытага рамяства — роспісу па шкле. Шмат яе вучняў і паслядоўнікаў працягваюць яе справу, узбагачаюць беларускую народную культуру. У сваіх работах умеліца “занатавала” народныя абрады і святы, рэлігійныя сюжэты, мясцовыя архітэктурныя славутасці.

Галоўная мэта творчай дзейнасці Марыі Кулецкай – захаваць і перадаць нашчадкам майстэрства нашых продкаў.

Літаратура:


1. **Здановіч, І. Ю.** Кулецкая Марыя Мікалаеўна // Рупліўцы беларускага нацыянальнага адраджэння : грамадска-літаратурны даведнік / Іван Здановіч. Пружаны, 2008. С. 65–66.
2. **“Відзікі:** беларускі традыцыйны роспіс на шкле: каталог выставы, [5 красавіка — 14 мая 2023 г., Мастацкая галерэя "Цэнтр" Мінскага абласнога цэнтра народнай творчасці] / укладальнік Вольга Трубач. — Мінск: Каўчэг, 2025. — 170, [1] с. : каляр. іл.
3. **Зялевіч, А.** Віншаванні для Марыі Мікалаеўны : 70-гадовы юбілей адзначае народны майстар Рэспублікі Беларусь Марыя Мікалаеўна Кулецкая / Алена Зялевіч ; фота з архіва дзіцячай бібліятэкі // Раённыя будні. Пружаны, 2020. 25 лістапада (№ 94). С. 6.
4. **Быцко, Л.** М. Шклінкі-маляванкі Марыі Кулецкай / Ларыса Быцко // Культурнае жыццё Брэстчыны / ДзУК "Брэсцкі абласны грамадска-культурны цэнтр. — № 10. — С. 50—51 : фат. — Брэст, 2020.
5. **Зялевіч, А.** Малюе сэрца, а не рука... : юбілейная выстава творчых работ народнага майстра Рэспублікі Беларусь М. М. Кулецкай адкрылася ў малой выставачнай зале абласнога грамадска-культурнага цэнтра / Алена Зялевіч // Раённыя будні. Пружаны, 2020. 16 снежня (№ 100). С. 4.

6. **Сядова, І.** Галоўны талент — захапленне прыгожым : пра свае захапленні і уменні Марыя Мікалаеўна Кулецкая расказала падчас імпрэзы, наладжанай ў цэнтральнай раённая бібліятэцы імя М. Засіма / Ірына Сядова ; фота аўтара // Раённыя будні. Пружаны, 2020. 6 лістапада (№ 88/89). С. 7 : фат.
7. **Зялевіч, А.** Палатняныя перапляценні : [У гарадскім Палацы культуры М. Кулецкая правяла майстар-клас] / Алена Зялевіч // Раённыя будні. Пружаны, 2021. 17 лістапада (№ 90). С. 6 : фат.
8. **Клімава, А.** Па родных мясцінах : народны майстар Марыя Кулецкая правяла майстар-клас па вырабе лялькі ў в. Стойлы / Аксана Клімава ; фота Ірыны Сядовай // Раённыя будні. Пружаны, 2021. 16 чэрвеня (№ 46). С. 6 : фат.
9. **Паляшчук, А.** Майстар шкляной прыгажосці : выстава работ "Шкляныя вобразы Радзімы" народнага майстра Рэспублікі Беларусь М.М. Кулецкай адкрылася ў Ружанскім палацавым комплексе роду Сапегаў у Ружанах / Алена Паляшчук // Краязнаўчая газета. 2021. № 42. С. 7 : фат.
10. **Сацута, А. Н.** Каталог на память : К 70-летию народного мастера Беларуси Марии Кулецкой районная библиотека имени М. Засима и областной общественно-культурный центр подготовили и издали памятные каталоги / Алена Сацута // Заря. 2021. 13 марта (№ 20). С. 9.

11. **Смайлік, А.** "Сардэчныя замалёўкі" Марыі Кулецкай : да 70-годдзя народнага майстра Беларусі Марыі Кулецкай раённая бібліятэка імя М. Засіма і абласны грамадска-культурны цэнтр падрыхтавалі і выдалі памятныя каталогі / Алеся Смайлік // Раённыя будні. Пружаны, 2021. 3 сакавіка (№ 17). С. 8 : фат.
12. **Арлова, І.** Сапраўдныя карані : пра адкрыццё выставачнага праекта ў Мастацкім музеі "Брэстчына этнаграфічная. Пружанска-Камянецкі край" / Ірына Арлова ; фота Валерыя Караля // Заря. 2023. 1 марта (№ 16). С. 12.
13. **Басак, Р.** Сувенірная лаўка: падарункі, зробленыя з душой : [вырабы М. Кулецкай можна набыць у сувенірнай лаўцы] / Руслан Басак ; фота аўтара // Раённыя будні. Пружаны, 2023. 27 снежня (№ 101). С. 3.
14. **Казловіч, В.** Формула жыцця : [101-гадовая Еўдакія Мікітаўна Клімашэвіч былая настаўніца і бібліятэкар, маці М. М. Кулецкай] / Валянціна Казловіч ; фота Паўла Богуша // Сельская газета. 2023. 11 февраля (№ 18). С. 21.
15. **Козлович В.** Голуби на стекле : про династию мастеров из Пружан — Марию Кулецкую и её мать 101-летнюю Евдокию Климашевич / Валентина Козлович // СБ Беларусь сегодня. 2023. 24 февраля (№ 37). С. 11.
16. **Кулецкая, М. М.** Паляванне на ваўкоў : аўтар дзеліцца ўспамінамі пра тое, як бацька леснік

хадзіў на паляванне./ Марыя Кулецкая // Раённыя будні. Пружаны, 2023. 16 верасня (№ 72). С. 16.

17. **Рудак, А.** Акенца ў свет прыгожага : што такое "відзікі" і чым яны адметныя? Беларускі традыцыйны роспіс па шкле на Пружаншчыне захаваўся дзякуючы Марыі Кулецкай / Антон Рудак ; фота аўтара // Культура. 2023. 22 красавіка (№ 16). С. 4.
18. **Рудак, А.** Яскравыя акцэнты народных традыцый : статус гісторыка-культурнай каштоўнасці нададзены роспісу па шкле, які аднавіла на Пружаншчыне народны майстар М. М. Кулецкая / Антон Рудак ; фота Таццяны Матусевіч // Культура. - 2023. 11 сакавіка (№ 10). С. 4.
19. **Адамчук, В.** Наіўнае мастацтва. Але такое шчырае / Валерыя Адамчук // Раённыя будні. Пружаны, 2024. 10 студзеня (№ 2). С. 5.
20. **Гадуйка, І.** Маляванкі да свята : у Хараўскім сельскім клубе-бібліятэцы адбылася сустрэча з народным майстрам Рэспублікі Беларусь Марыяй Кулецкай / Ірына Гадуйка // Раённыя будні. Пружаны, 2024. 4 мая (№ 34/35). С. 5.
21. **Кудравец, Н. П.** О присвоении звания "Почетный гражданин Пружанского района" : решение Пружанского районного Совета депутатов от 9 декабря 2024 г. № 29 / Н. П. Кудравец // Раённыя будні. Пружаны, 2025. 22 студзеня (№ 6). С. 4.
22. **Козлович, В.** Пример оптимизма и жизнелюбия : старейшая жительница Пружан Е. Н. Климашевич

ведет активный образ жизни / Валентина Козлович ; фото Павла Богуша // СБ. Беларусь сегодня. 2025. 22 января (№ 13). С. 11.

# “Чароўная палітра
# Марыі Кулецкай”

Літаратурна-краязнаўчае выданне
(Дапоўненае і дапрацаванае)

Складальнік : Казлоўская Н.А.
Рэдакцыя, дызайн,
адказны за выпуск : Казлоўская Н.А.

Кастрычнік, 2025

225 133 г. Пружаны, вул. Савецкая, 30
Цэнтральная раённая бібліятэка імя М. Засіма

8(01632) 2 85 75